*У.У.ТРАМБІЦКІ*

## ПРАБЛЕМА ЎСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

Асноўнымі суб'ектамі развіцця грамадства з'яўляюцца асоба, працоўныя калектывы, сям'я, дзяржава, розныя саюзы і аб'яднанні, грамадства як сістэма. У канцы XX – пачатку XXI ст. важнае значэнне набывае праблема ўзаемадзеяння асобы і грамадства як цэласнай з прыродай сістэмы. Разуменне ўстойлівасці як выніку ўзаемадзеяння асобы і грамадства, грамадства і прыроды, чалавека і космасу мае важнае значэнне для змянення каштоўнасных арыентацый чалавека і грамадства з мэтай захавання чалавека ва ўмовах нестабільнасці і арганізацыі грамадскай дзейнасці на ідэалах, якія здольныя прывесці чалавека і грамадства да стабільнага развіцця.

Навукова-тэарэтычнае асэнсаванне суб'екта ўстойлівага развіцця грамадства можна знайсці ў працах Платона, Арыстоцеля, Ф.Аквінскага, Д.Віка, Ж.Кандарсэ, І.Гердэра, Г.Лесінга, Т.Гобса, Г.Гегеля, І.Канта, З.Фрэйда, Ф.Бродэля, П.Сарокіна, глабалістаў, антыглабалістаў і інш. Але далёка не ўсе тэарэтычныя мадэлі, якія прапаноўваліся культуролагамі, філосафамі, сацыёлагамі, палітыкамі, гісторыкамі рэалізуюцца. Часта іх прагнозы нагадваюць фрагменты утапічных раманаў. Дзейнасць рэальных індывідуальных і калектыўных суб'ектаў не заўсёды супадае з навукова-тэарэтычнымі мадэлямі, якія так або інакш тлумачаць устойлівасць у развіцці грамадства.

На прыкладах традыцыйных аграрных і індустрыяльных цывілізацый, што доўгі час забяспечвалі ўстойлівасць у развіцці грамадства, можна паказаць, як ва ўмовах станаўлення новай інфармацыйнай цывілізацыі перад чалавекам – асноўным суб'ектам гістарычнага працэсу і аўтарам свайго асабістага лёсу – узнікаюць зусім іншыя праблемы ў параўнанні з чалавекам аграрных і індустрыяльных цывілізацый.

Праблема асобы (у больш шырокім сэнсе – чалавека) заўсёды знаходзіцца ў цэнтры навуковага і мастацкага асэнсавання. У сучасных сацыяльных умовах да праблемы асобы, яе ролі ў жыцці дзяржавы і грамадства назіраецца павышаны інтарэс філосафаў, псіхолагаў, педагогаў, біёлагаў, гісторыкаў, археолагаў, палеантолагаў, мастакоў і літаратараў. Прадстаўнікі многіх навук займаюцца вывучэннем такіх яе аспектаў, як суадносіны нерацыянальнага і рацыянальнага, свядомага і несвядомага, філагенезу і антагенезу, генетычнага і сацыяльнага.

За апошні час адбылося шмат перамен у розных сферах чалавечай дзейнасці. Цяпер нікому не трэба даказваць, што многія камп'ютэрныя і іншыя інфармацыйныя тэхналогіі здольныя дапамагаць асобе як у захаванні, так і ў перадачы інфармацыі на вялікія адлегласці. Чалавецтва апынулася перад неабходнасцю выпрацоўкі прынцыпова новай парадыгмы жыцця: дасягненні ў галіне інфармацыйных тэхналогій пачынаюць уплываць на жыццё чалавека і грамадства, дапамагаюць рэалізаваць асобе самыя фантастычныя прадбачанні футуролагаў. Не так даўно здавалася, што вучоны, які працуе ў сваім пакоі і мае сувязь з навейшымі дасягненнямі ў розных сферах чалавечай дзейнасці, гэта фантастыка. У сучаснай цывілізацыі тэарэтычная мадэль фантаста стала рэальнасцю.

Ва ўмовах узаемадзеяння (дыялога) культур і цывілізацый роля асобы ў жыцці дзяржавы і грамадства ўзрастае дзякуючы таму, што асоба мае доступ да інфармацыі і можа выкарыстоўваць яе ў асабістых і грамадскіх мэтах.

У класічнай аграрнай і нават індустрыяльнай цывілізацыі жаданне асобы быць аўтарам не толькі асабістага лёсу, але і іншых людзей рэалізоўвалася дзякуючы ўладзе на сродкі вытворчасці. Такое жаданне маглі рэалізаваць не ўсе. У Францыі, напрыклад, у 1936 г. кіруючыя рашэнні залежалі ад двухсот сямействаў. Магчымасць быць суб'ектам кіравання залежала не толькі ад здольнасцей, але і ад матэрыяльнага багацця, ад узаемадзеяння паміж сабой многіх сацыяльных структур грамадства як цэласнай сістэмы. Аналагічная сітуацыя была і стагоддзем раней: на дванаццаць мільёнаў чалавек прыходзілася толькі адна тысяча вельмі багатых людзей. Іерархічнасць у сацыяльнай структуры грамадства выконвала і выконвае важную функцыю ў жыцці асобы і грамадства. У 1688 г. у Англіі было прыблізна 36 тысяч сямействаў, чый гадавы даход перавышаў 200 фунтаў. Меншасць (лорды, бароны, сквайеры, купцы, юрысты і іншыя) складала 2%–6% ад агульнай колькасці насельніцтва. У Венецыі ў 1575 г. меншасць была

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прадстаўлена пяццю працэнтамі, у Нюрнбергу ў XVI ст. улада належала 150–200 выбраным на 20 тысяч жыхароў горада і на 20 тысяч – у яго акрузе. Меншасць вырашала фактычна ўсе пытанні, ні перад кім не адказваючы за свае дзеянні. Улада ў Нідэрландах у 1603 г. залежала ад 200 купцоў, а арыстакратыя ў XVII ст. у гэтай краіне налічвала 10 тысяч асоб пры колькасці насельніцтва 2 мільёны чалавек. Меншасць Фларэнцыі XV ст. складала каля трох тысяч, а ў 1760 г. – 800–1000 асоб. Па-сапраўднаму багатых у Англіі XVII ст. было 600–700 чалавек (менш за 1% ад агульнай колькасці насельніцтва). Багатыя адпаведнага перыяду Францыі складалі ад 1% да 1,5%. Самы высокі працэнт (8–10) багатых людзей у Еўропе зафіксаваны ў Польшчы. Але ў гэтай краіне далёка не ўсе былі багатымі. Жыццёвы ўзровень многіх мала чым адрозніваўся ад сялян.

У сучасным грамадстве сітуацыя амаль не змянілася. Доля багатай часткі насельніцтва планеты (“залаты мільярд”) складае 83% сусветнага даходу, а на долю большасці (80%) насельніцтва прыпадае толькі 17%. І цяпер да вяршыні эканамічнай піраміды ідуць патокі фінансаў, багацце інтэлекту [1, с. 5]. У Савецкім Саюзе іерархічная піраміда выглядала так: багатых – 2,3%, сярэдні слой – 11,2%, бедныя – 76,5% [1, с. 5–6].

Аднак погляд на гістарычны працэс як на імкненне людзей заняць у сацыяльнай структуры грамадства месца на вяршыні эканамічнай піраміды значна спрашчае рэальную гісторыю, таму што сярод ідэалаў і мэт сацыяльных мадэляў будучыні былі і зусім іншыя: стварыць не іерархічнае, а сацыяльна справядлівае грамадства, у якім усе суб’екты гістарычнага працэсу будуць раўнапраўнымі. На час распаду СССР была зафіксавана эканамічная піраміда.

Вядомы амерыканскі сацыёлаг рускага паходжання П.Сарокін іерархічнасць грамадства паказаў больш складана. З пункту гледжання эканамічнага статусу людзей іерархічнасць ён назваў эканамічнай стратыфікацыяй. Існуюць пераходы людзей не толькі ўверх, да больш багатага становішча, але і ўніз. Канкрэтна-гістарычны матэрыял Еўропы і Амерыкі яго пераканаў, што тэорыя бясконцага эканамічнага прагрэсу памылковая. На прыкладзе шасцісотгадовага эканамічнага развіцця Францыі П.Сарокін вылучыў цыклы заняпаду (1201–1350 гг.), росту (1350–1500 гг.), заняпаду (1501–1650 гг.) і перыяд стабілізацыі, дзе цяжка вылучыць якую-небудзь тэндэнцыю (1701– 1790 гг.). Перыяды флуктуацыі склалі пастаянную велічыню – 150 гадоў [9, с. 239]. Акрамя эканамічнай, былі вылучаны палітычная, сацыяльная і прафесійная стратыфікацыі. У якасці каналаў вертыкальнай мабільнасці П.Сарокін вылучаў армію, царкву, школу, палітычныя арганізацыі і палітычныя партыі, арганізацыі па стварэнні матэрыяльных каштоўнасцей і сям’ю. Каналы стратыфікацый у грамадстве выконваюць ролю “фільтраў”.

У XX ст. рэзервы індустрыяльнага грамадства вычарпалі сябе. Гісторыя грамадства як гісторыя самастойных дзяржаў, ізаляваных краін і народаў пад уплывам новых інфармацыйных тэхналогій паступова ператвараецца ў глабальную гісторыю. У сучаснай інфармацыйнай цывілізацыі змены ў жыцці асобных краін і народаў пачынаюць аказваць уплыў на ўвесь свет. Дыялог розных сфер сацыяльных сістэм вядзе да трансфармацыі культур і традыцый. Працэс узаемадзеяння культур і цывілізацый суправаджаецца як пазітыўнымі, так і негатыўнымі аспектамі. У адрозненне ад традыцыйных культур і цывілізацый, у якіх існуюць устойлівыя спосабы ўзаемаадносін асобы і грамадства, сучасная інфармацыйная цывілізацыя характарызуецца ўзрастаннем свабоды асобы. Росту свабоды індывіда дапамагаюць не толькі грамадскія адносіны той краіны, дзе жыве чалавек, але і павелічэнне магчымасцей асобы будаваць свае адносіны з навакольным светам і людзьмі на аснове ведаў традыцый і каштоўнасцей іншых індывідуальных і калектыўных суб’ектаў. У такой сітуацыі для многіх развіццё навукі, тэхнікі, тэхналогіі становіцца мэтай і сэнсам грамадскага прагрэсу, адбываецца сумяшчэнне ведаў аб тым, што павінна быць выканана ў дакладнай сітуацыі з больш глыбокімі структурамі асобы. У інфармацыйнай цывілізацыі поспех асобы залежыць ад умення будаваць “апераджальныя мадэлі будучыні”. Прагназіраванне будучыні з’яўляецца важнейшым аспектам сацыяльнага пазнання і свядомай дзейнасці асобы, нацыі, калектываў. Прадбачанне выступае ў якасці ведаў аб тым, што яшчэ не існуе або існуе толькі на ўзроўні “жаданай” будучыні. Да асаблівасцей футуралагічных прагнозаў будучыні ў інфармацыйнай (і не толькі) цывілізацыі можна аднесці тое, што на іх аказваюць уплыў асабістыя і калектыўныя ўяўленні аб будучыні, якія могуць садзейнічаць як росквіту, так і заняпаду культур і цывілізацый. У жыцці асобы і грамадства быццам працуе фантастычная “машына часу”, якая прапануе чалавеку і грамадству свае сцэнарыі будучыні. Ідэалы аб будучыні аказваюць уплыў на сучаснасць не менш, чым гістарычны працэс, які быў да нас. Справа ў тым, што чалавек адрозніваецца ад жывых істот свядомасцю, можа “мадэляваць” будучыню. Больш таго, ідэальныя мадэлі будучыні чалавек сваёй працай можа матэрыялізаваць. Сучасныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйныя тэхналогіі могуць скараціць тэрмін матэрыялізацыі ідэй. У гэтым заключаецца прыцягальная сіла інфармацыйных тэхналогій.

Вывучэнне ўплыву новых інфармацыйных тэхналогій на чалавека паказвае, што карыстанне імі не толькі дапамагае чалавеку ўступаць у дыялог з іншымі культурамі, традыцыямі, "сціскае" гістарычны працэс, але і ўплывае на псіхалогію аператара і яго менталітэт. Інфармацыя, успрынятая праз манітор, аказвае ўплыў на падсвядомасць. Падобны "дыялог" здымае прасторава-часавыя бар'еры. У карыстальніка інтэрнета ўзнікаюць эмоцыі асабістага ўдзелу ў падзеях сеткі, змяняюцца каштоўнасці: для яго больш важнай становіцца віртуальная інфармацыя, а не каштоўнасці рэальнага жыцця. Асобы злачынцаў (з ліку моладзі, якая працавала з сеткай) характарызуюцца тым, што ў сістэме іх каштоўнасцей і эмоцый дамінуюць ірацыянальныя вобразы, разбуральныя адносіны да рэчаіснасці [6, с. 122]. У час узаемасувязі сеткі і чалавека адбываецца праграміраванне і самога чалавека. Гэта нешта іншае ў параўнанні з нейралінгвістычным праграмі-раваннем, пры якім на вербальным ўзроўні аказваецца ўплыў на ментальныя структуры асобы. Названы аспект праблемы ўскладняецца тым, што ўладаль-нікі сеткі свядома могуць закладваць "патрэбную" інфармацыю ў сетку.

З улікам таго, што ў канцы 2003 г. колькасць карыстальнікаў інтэрнета дасягнула мільярда, знаёмства моладзі з працэсамі, якія адбываюцца ў карыстальніка сеткі на ўзроўні свядомасці і падсвядомасці, становіцца неабходнасцю.

Дыялог культур па-свойму адлюстраваны ў постмадэрнізме. Многія яго прадстаўнікі лічаць, што чалавек постіндустрыяльнага грамадства выступае супраць любой улады, хрысціянскай гісторыі, філасофіі Гегеля, пазітывізму, тэорыі грамадскага прагрэсу, адказваецца ад падзелу сусветнай гісторыі на мінулую, сучасную і будучаю. Рэчы, зробленыя чалавекам, прадстаўнікамі постмадэрнізму разглядаюцца як комплекс ідэй, якія ўзніклі ў розны час. Сучасная мадэль аўтамашыны разглядаецца як вынік навукова-тэхнічных дасягненняў розных эпох: адна частка аўтамашыны – вынаходніцтва пачатку XX ст., другая – з'явілася 200 гадоў таму, колы – вынаходніцтва эпохі неаліту.

Аналагічна разглядаюцца і духоўныя каштоўнасці. Многія ідэі Платона з'яўляюцца актуальнымі для сучаснай эпохі. Думкі як акты мыслення разглядаюцца не як народжаныя і не як прыпамінанне, а як мысленне без вобразаў [2, с. 208]. Ж.Ліятар лічыць, што ў постіндустрыяльным грамадстве змяняецца статус ведаў. Апошнія ствараюцца з мэтай іх продажу. Прычым ведамі распараджаецца не дзяржава, а асобы. У постіндустрыяльнай цывілізацыі ўлада пераходзіць да спецыялістаў, да тых, хто прымае рашэнні: кіраўнікі прадпрыемстваў, вялікіх прафесійных арганізацый, функцыянеры, прафсаюзы, палітычныя партыі і рэлігійныя канфесіі [3, с. 9–43].

Постмадэрн у філасофіі па-свойму выявіў фарміраванне новай інфармацыйнай цывілізацыі. Безумоўна, новае інфармацыйнае грамадства ўжо аказвае ўплыў на асобу і чалавека, патрабуе асэнсавання таго, што адбываецца вакол нас у выніку ўзаемадзеяння культур. На наш погляд, такая сітуацыя патрабуе ад асобы не адказу ад розуму, інтэлекту і філасофіі, а больш крытычна суадносіць свае ідэальныя прагнозы з асэнсаваннем рэальных працэсаў, рэальных дзеянняў, нягледзячы на тое, што час асэнсавання подобных праблем у інфармацыйнай цывілізацыі скарачаецца.

Сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя ў 1999 г. у Расіі, паказваюць, што 59% апытаных становішча ў краіне і свеце лічаць як няўстойлівае, 32% – як крызіснае і толькі 8% – як нармальнае. Праблема суб'екта ўстойлівага развіцця грамадства актуальная і ў сувязі з глабальнымі праблемамі сучаснай цывілізацыі. Чалавек, будучы асноўным суб'ектам культуры і цывілізацыі, ва ўмовах грамадскай нестабільнасці многімі філасафамі і культуролагамі разглядаецца не як цэнтр, а як нейкая мяжа [8]. Такі падыход сведчыць аб з'яўленні новай антрапалогіі, дзе чалавек разглядаецца ў якасці адкрытай сістэмы паміж унутранай і знешняй энергіяй. На новае тлумачэнне чалавека аказалі ўплыў таксама сінергетыка і яе імкненне апісаць новыя рэальнасці (у тым ліку і антрапалагічную) як вынік змянення сістэмы пад уплывам многіх фактараў. Феномен антрапалагічнай граніцы вобразна апісаны даследчыкамі на прыкладзе эфекту ўзмаху крылаў матыля, які прыводзіць да важных змяненняў у зусім іншых сістэмах.

Праблема суб'екта ўстойлівага развіцця грамадства звязана з суадносінамі дэмаграфічных, сацыяльна-эканамічных, медыка-біялагічных, экалагічных, культуралагічных і іншых праблем. У дадзеным артыкуле праблема свядома абмежавана сацыяльна-культурным аспектам – параўнальным аналізам ролі суб'екта ў традыцыйных (аграрнай і індустрыяльнай) і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнай цывілізацыях. Чалавек як асноўны суб’ект культуры і цывілізацыі ва ўмовах росту сродкаў камунікацыі мае большы выбар у сваёй дзейнасці, але і адказнасць яго за свае дзеянні і свой выбар значна ўзрастае.

Аўтар артыкула далучаецца да думкі тых даследчыкаў [9], якія вырашэнне праблемы ўстойлівага развіцця грамадства ў Беларусі звязваюць са станаўленнем сярэдняга класа. Згодна з апошнімі данымі структура беларускага грамадства выглядае наступным чынам: 32 % – ніжні слой (служачыя без спецыяльнасці, рабочыя нізкай кваліфікацыі, пенсіянеры і інваліды, сяляне, вучні і іншыя); 40 % – базавы слой, велічыня даходу якога ад бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ) да аднаго мінімальнага пражытачнага бюджэту (МПБ); 21 % – сярэдні слой; 5 % – верхні слой; 1,3 % – эліта. Станаўленне ў Беларусі сярэдняга слоя надае грамадству як цэласнай сістэме ўстойлівасць. Але даходы ўсіх слаёў беларускага грамадства яшчэ далёкія ад сярэднестатыстычных даходаў перадавых краін.


1. *Зайченко А.* Имущественное неравенство // Аргументы и факты. – 1989. – № 27.

2. *Делёз Ж. и Гваттари Р.* Ризома // Философия эпохи постмодернизма: Сб.переводов и рефератов. – Мн.: Изд. ООО «Красико-принт», 1996. – 208 с.

3. *Лиотар Ж.* Состояние постмодерна / Пер. с фр. Н.А.Шматко. – М.: Ин-т эксперим. социологии. – СПб.: Алетейя, 1998.

4. *Лічбы* па працэнтных суадносінах багатых і бедных узяты з работы: *Бродель Ф.* Материальная цивилизация, экономика и капитализм, XV–XVIII вв. – М.: Прогресс, 1988. – Т. 2. – С. 499–500.

5. *Мясникова А.А.* Экономика постмодернизма и отношения собственности // Вопросы философии. – 2002. – № 7. – С. 5.

6. *Рашковский Е.* Постмодерн: культурная революция или контрреволюция? // МЭиМО. – 1999. – № 7. – С. 122.

7. *Рейман Л.Д.* Информацинное общество и роль телекоммуникаций в его становлении // Вопросы философии. – 2001. – № 3. – С. 6–7.

8. *Соколова Г.* Средний класс: корона и корни // Беларуская думка. – 2003. – № 12. – С. 77–83.

9. *Сорокин П.* Человек. Цивилизация. Общество. – М.: Политиздат, 1992.

10. *Хоружий С.С.* Человек и его три дальних удела. Новая антропология на базе древнего опыта// Вопросы философии. – 2003. – №1. – С. 38–62.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ